УДК 745.542: 79.01/.09 (476/1)

**Л. Л. Чырвонцава,**
*выкладчык спецыяльных дысцыплін аддзялення дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя М. К. Агінскага», г. Маладзечна, Рэспубліка Беларусь*

# МАЛАДЗЕЧАНСКАЯ ШКОЛА ВЫЦІНАНКІ

**Анатацыя.** *Артыкул прысвечаны праблемам папулярызацыі, захавання і развіцця мастацтва выцінанкі як элемента нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці. Аўтар знаёміць з канкрэтным вопытам работы ў гэтым напрамку маладзечанскай школы выцінанкі, як засвойваецца навучэнцамі Маладзечанскага музычнага каледжа імя М. К. Агінскага гэты від мастацтва. Засноўваючыся на гістарычных звестках аб з'яўленні і развіцці дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, разглядаецца яго сучасны стан у асобным рэгіёне. Вылучаюцца і апісваюцца характэрныя асаблівасці беларускай школы выцінанкі.*

**Ключавыя словы:** *выцінанка, мастацкае выразанне з паперы, маладзечанская школа выцінанкі, вырабы з паперы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, нематэрыяльная культурная спадчына.*

**L. Chyrvontsava,**
*Teacher of special disciplines of the Department of Decorative and Applied Arts of the Educational Institution "Molodechno State Music College named after M. K. Oginsky", Molodechno, Republic of Belarus*

# MOLODECHNO SCHOOL OF PAPERCUTTING

**Abstract.** *The article is devoted to the problems of popularization, preservation and development of the art of papercutting as an element of intangible cultural value. In it, you can get acquainted with the specific experience of working in this direction of the Molodechno school of Papercutting. The article examines the main historical information about this type of decorative and applied art and the current state in a particular region, highlights and describes the characteristic features of the school, the process of teaching vytinanka at the Department of Decorative and Applied Arts of the Molodechno Music College named after M. K. Oginsky.*

**Key words:** *papercutting, artistic paper cutting, Molodechno school of papercutting, paper crafts, decorative and applied art, intangible cultural heritage.*

Захаванне і перадача нематэрыяльнай культурнай спадчыны спрыяе развіццю светапогляду і фарміраванню нацыянальнай ідэнтычнасці маладога пакалення. Веды і павага да сваіх культурных традыцый забяспечваюць пераемнасць у часе. Зацікаўленасць моладзі да традыцыйных відаў мастацтва і веданне некаторых відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва могуць страціцца, калі яны не будуць ужывацца ў сучасным дызайне навакольнага асяродку і адукацыйных праграмах навучальных устаноў.

*Мэты* артыкула – разгледзець такі элемент нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці, як мастацтва выцінанкі, і вызначыць тэндэнцыі яго развіцця ў рэгіёне; ахарактаразаваць асаблівасці маладзечанскай школы выцінанкі; паказаць магчымасці папулярызацыі беларускай выцінанкі сярод шырокіх слаёў насельніцтва.

Вялікую ролю ў захаванні і перадачы ведаў і майстэрства мае выкладанне выцінанкі як вучэбнага прадмета. Калі не будзе інтэграцыі гэтай нематэрыяльнай каштоўнасці ў праграмы навучання мастацкіх школ, мастацкіх сярэднеспецыяльных устаноў, творы гэтага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва страцяць якасць выканання, выразнасць кампазіцыі і стылізацыі вобразаў. Выцінанка мае высокі патэнцыял крэатыўнасці і ўзбагачае навучальны працэс творчым падыходам на занятках выяўленчага мастацтва ў агульнаадукацыйных школах і дзіцячых садках, кружках ва ўстановах пазашкольнай адукацыі. Мастацкае выразанне не патрабуе спецыфічных матэрыялаў і інструментаў, мае простую тэхналогію выканання і хуткі рэзультат творчасці. Веды аб народных традыцыях выразання, працэс выканання ўплываюць на псіхалагічнае і інтэлектуальнае развіццё дзяцей, паколькі аказваюць станоўчае ўздзеянне на розныя структуры асобы. Такім чынам, фарміруецца эстэтычны і мастацкі густ, актывізуецца пазнавальная дзейнасць вучняў. Выразанне выцінанак паляпшае дробную маторыку, якая ўплывае на развіццё памяці, узровень валодання мовай, вучыць канцэнтрацыі ўвагі, спрыяе разумоваму, эмацыянальнаму развіццю асобы.

*Беларускае мастацтва выцінанкі.* Выцінанка – адзін са старажытных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на тэрыторыі Беларусі з канца XVI ст. Мастацкае выразанне ўзнікла ў Кітаі дзякуючы вынаходніцтву паперы. Тэхналогія вырабу паперы з цягам часу стала вядомай і ў іншых краінах: спачатку суседніх – Японіі, Карэі, Інданезіі, а потым і ў дальніх – Персіі, Турцыі, краінах Еўропы. На тэрыторыі Беларусі

першая папера была замежнай вытворчасці. Толькі ў 60-я гг. XVI ст. з’явілася першая паперня ў Нясвіжы, а ў XVIII ст. працавала каля 30 папяровых фабрык.

Даследчыкі лічаць, што першымі папяровымі выразкамі былі кустодыі – невялікія папяровыя аркушы з ажурна выразаным краем для аховы васковых і сургучных пячатак на дакументах (мал. 1). На працягу некалькіх стагоддзяў мастацкае выразанне было элітарным і распаўсюджаным толькі сярод шляхты і духавенства. Сілуэтныя выразаныя карцінкі выконваліся ў рэалістычнай манеры, сустракаліся выявы людзей, прыродных матываў, бытавых і жанравых сцэн, сакральныя вобразы. Рамеснікі выкарыстоўвалі шаблоны, трафарэты з паперы для выканання вырабаў з другіх матэрыялаў (дрэва, металу, каменю). З даступнасцю паперы ў сялянскім асяроддзі з’явілася ўтылітарная выцінанка. Народная выцінанка адрознівалася тэхнікай выканання. Папера складвалася рознымі спосабамі, і па згібах выразаліся разнастайныя ўзоры з асобных элементаў. Выразаныя ўзоры нагадвалі арнаменты ткацтва, разьбы па дрэве. Вокны аздаблялі папяровымі фіранкамі, рабіліся падзоры на паліцы мэблі. Карункамі, кветкамі ўпрыгожвалі чырвоны кут і абразы, элементы святочных убораў і прадметаў (галаўныя ўборы, калядныя зоркі, батлейкі).

У першай палове XX ст. мастацтва выразання перажывала кароткачасовы росквіт. Інтэр’ер беларускай хаты ўпрыгожваўся вырабамі ткацтва і вышыўкі, роспісам, выцінанкай. На жаль, гістарычныя абставіны (рэвалюцыя, войны) прывялі да частковага заняпаду гэтага мастацтва. З-за нетрываласці матэрыялу від быў мала даследаваны. Выцінанкі выразаліся з газет, упаковачнай і цыгарэтнай паперы, таму людзі не імкнуліся іх зберагаць, прасцей было зрабіць новыя. Толькі з пачаткам 80-х гг. XX ст. выцінанка вярнулася ў новым сучасным рэчышчы, але з выразным традыцыйным напрамкам. Даследчая дзейнасць па аднаўленні традыцыйных узораў, па выяўленні носьбітаў гэтага віду народнай творчасці спрыяла цікавасці да выцінанкі аматараў, выкладчыкаў і прафесійных мастакоў.

Стваральнікам Маладзечанскай школы выцінанкі з’яўляецца Вікторыя Мікітаўна Чырвонцава (1937–2014; мал. 5). З 1985 г. яна працавала настаўнікам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (ДПМ) у ДМШ г. Маладзечна і пачала ўводзіць у навучальны працэс мастацтва выразання з паперы. Праца з выцінанкай вельмі спадабалася вучням. Вікторыя Мікітаўна распрацавала рабочую праграму па выцінанцы для малодшых і старэйшых класаў мастацкай школы. У 1992 г. Маладзечанскі гарвыканком даў дазвол на адкрыццё «класа народнага мастацтва» пры ДМШ для выпускнікоў школ па спецыяльнасці: выцінанка, апра-

цоўка саломы, ільну, разьба па дрэве. У 1995 г. было адкрыта аддзяленне ДПМ пры Маладзечанскім музычным каледжы імя М. К. Агінскага.

Багаты творчы і педагагічны вопыт В. М. Чырвонцавай дазволіў стварыць абгрунтаваную методыку выкладання выцінанкі і вучэбную праграму, зацверджаную Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь у 2001 г. На сённяшні час вучэбная праграма ўдасканальваецца: вядзецца даследніцкая праца над вывучэннем рэгіянальных тэхнічных прыёмаў вырабу выцінанкі, сімвалізму выяў і параўнальна аналізуецца мастацтва выразання другіх народаў. Маладзечанскі музычны каледж імя М. К. Агінскага з'яўляецца адзінай установай у рэспубліцы і за яе межамі, дзе прафесійна выкладаецца выцінанка.

На занятках па дысцыпліне «Работа ў матэрыяле» на 1-м курсе навучэнцы знаёмяцца з гэтым відам мастацтва. У аснове курса «Выцінанка» пакладзены прынцып «ад простага да складанага». Спачатку навучэнцы вывучаюць гісторыю гэтага віду ДПМ, асвойваюць розныя віды выразак і іх семантыку, спосабы выразання, стылізацыю выяў і адначасова знаёмяцца са старажытнай сімволікай. Заданні паступова ўскладняюцца. На заключным этапе навучэнцы выконваюць тэматычныя, арнаментальныя выцінанкі з сімвалічным зместам.

На 2-м курсе навучэнцы праходзяць тэхналагічную (творчую) практыку. Яны замацоўваюць тэарэтычныя і практычныя веды, атрыманыя на занятках па выцінанцы, і ў поўнай меры раскрываюць свае веды і ўменні, а таксама праяўляюць больш самастойнасці ў распрацоўцы эскізаў. Асаблівая ўвага надаецца якасці і тэхніцы выканання работы. Задачы тэхналагічнай (творчай) практыкі звязаны з выкананнем творчых тэматычных кампазіцый і выкарыстаннем стылізаваных сілуэтаў, сімвалічных арнаментаў і выяў.

На 3-м курсе па дысцыпліне «Работа ў матэрыяле» праводзяцца індывідуальныя заняткі, на якіх навучэнцы выконваюць курсавую работу (метадычную распрацоўку) па стылізацыі выяў у тэхніцы выцінанкі. Курсавая работа павінна адрозніваецца паўнатой раскрыцця тэмы, складанасцю і арыгінальнасцю кампазіцыі, высокай якасцю выканання. Навучэнцы ўдасканальваюць практычныя навыкі, адпрацоўваюць тэхніку выканання.

Веды і ўменні, атрыманыя па дысцыпліне «Работа ў матэрыяле», выкарыстоўваюцца і сістэматызуюцца непасрэдна на занятках перадДыпломнай практыкі. Дыпломная работа можа выконвацца ў тэхніцы выцінанкі і павінна быць завершаным мастацкім творам высокага ўзроўню.

Значны ўклад у папулярызацыю і развіццё выцінанкі як з'явы належыць выхадцам аддзялення ДПМ Маладзечанскага дзяржаўнага

музычнага каледжа імя М. К. Агінскага і Маладзечанскай дзіцячай мастацкай школы. Менавіта адсюль «пайшлі ў свет» выдатныя майстры і педагогі, выкладчыкі, якія сваёй працай і прыкладам павышалі зацікаўленасць моладзі да традыцыйнага беларускага выразання з паперы. Сёння асноўнымі носьбітамі традыцыі з'яўляюцца выкладчыкі аддзялення ДПМ Маладзечанскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. К. Агінскага – Л. Л. Чырвонцава, Н. Л. Чырвонцава, Л. М. Валковіч-Борыс, настаўнікі дзіцячай мастацкай школы мастацтваў г. Маладзечна А. А. Ралавец, Т. Э. Марчанкава, Г. А. Вайцюлевіч, С. І. Падкарытава, народныя майстры Беларусі – В. Бабурына, Н. Сухая, Ю. Каўрус. Шчырую зацікаўленасць гэтым відам народнай творчасці выказвае і дарослая частка насельніцтва – вялікая колькасць асоб удзельнічае ў шматлікіх майстар-класах, семінарах і форумах, прысвечаных мастацтву выразання.

Маладзечанская школа выцінанкі адметная выразнасцю кампазіцыі, майстэрскай стылізацыяй, якасцю тэхнікі выканання, лаканічнасцю вобразаў, выкарыстаннем традыцыйнай старажытнай сімволікі [2]. Яна прытрымліваецца правіла састаўлення ўзораў з выразак трох памераў (буйных, сярэдніх, дробных) і абапіраецца на набыткі культурнай нацыянальнай спадчыны, традыцыйных беларускіх арнаментаў, сімвалаў. У работах маладзечанскіх майстроў сустракаецца выкарыстанне асобных характэрных элементаў, тэхнічных прыёмаў, стылістычных вырашэнняў. Але ў той жа час кожны майстар не губляе сваю індывідуальную адметнасць і стылізацыю. Складаныя тэматычныя кампазіцыі майстроў маюць выразную структуру. Стылізацыю вобразаў яны ствараюць праз выразнасць геаметрычных форм і ажурных арнаментаў.

Мастацтвазнаўцамі адзначаецца ўласцівае маладзечанскім майстрам глыбокае веданне семантычных значэнняў як асноўных вобразаў, так і асобных элементаў кампазіцыі. Адна з асаблівасцей маладзечанскай школы выцінанкі – эксперыментальнае вырашэнне з матэрыялам, колерам, відам афармлення.

Склаўся шэраг тыповых сюжэтаў: святы беларусаў, міфалагічныя персанажы, народныя строі, архітэктурныя беларускія помнікі, архетыпічныя і арнаментальныя сімвалічныя вобразы, традыцыйныя кветкавыя кампазіцыі (мал. 8–13).

Выцінанка напрамку Маладзечанскай школы выкарыстоўваецца для выдання паштовак, кніг, прынтаў і вышыўкі на вопратцы, пры стварэнні ландшафтнай аздобы, інтэр'ерных элементаў, афармленні мерапрыемстваў, таксама служыць асновай графіці [6]. Маладзечанская выцінанка на сучасным этапе з'яўляецца ідэнтыфікатарам мясцовай культуры. Мастацтву выцінанкі характэрна эстэтычна-дэкаратыўная функцыя.

Традыцыя аздаблення інтэр'ераў і вокнаў на святы з кожным годам усё больш распаўсюджваецца ў гарадскім асяродку. У навучальных і адміністрацыйных установах, у жылых дамах Маладзечна можна ўбачыць на зімовыя святы ўпрыгожванні з выцінанак. Працы майстроў Маладзечанскай школы выцінанкі замаўляюць для аздаблення інтэр'еру і выкарыстоўваюць у карпаратыўнай паліграфічнай прадукцыі розныя арганізацыі і кампаніі. Маладзечанская выцінанка ўжо «выходзіць» за межы краіны і ўплывае на мастацтва суседніх краін – Польшчы, Расіі, Літвы, Украіны. Менавіта таму ў 2016 г. на базе маладзечанскага каледжа праводзіўся VI Міжнародны сімпозіум «Мастацкае выразанне: форма і колер», у якім было каля 70 удзельнікаў (майстроў выцінанкі, мастакоў, мастацтвазнаўцаў) з Польшчы, Расіі, Францыі, Літвы, Украіны, Беларусі.

На сучасным этапе маладзечанская школа выцінанкі з'яўляецца важным элементам нематэрыяльнай культуры ў плане яго падтрымкі выкладчыкамі аддзялення ДПМ Маладзечанскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. К. Агінскага і настаўнікамі ДМШ г. Маладзечна, народнымі майстрамі Беларусі. Яны добра разумеюць неабходнасць захавання, развіцця і перадачы гэтага элемента нематэрыяльнай спадчыны пераемнікам. Таму стараюцца распаўсюджваць веды аб гэтым відзе народнага традыцыйнага мастацтва. Выкладчыкі і майстры праводзяць выстаўкі, удзельнічаюць у майстар-класах, семінарах, экскурсіях, форумах, конкурсах, сімпозіумах, пленэрах. Выцінанка – гэта ўжо брэнд Беларусі. З 2021 г. у музычным каледжы імя М. К. Агінскага дзейнічае мастацкая галерэя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, і адзін з залаў прысвечаны маладзечанскай школе выцінанкі. Там прадстаўлены работы майстроў і выпускнікоў аддзялення ДПМ (мал. 14, 15).

Шмат майстроў выцінанкі і яе прыхільнікаў станоўча адносяцца да таго, што гэты элемент узяты пад ахову дзяржавы. Згодна з Пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 30.04.2021 г., № 25, беларускаму мастацтву выцінанкі надалі статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Атрыманне ведаў аб нематэрыяльнай культурнай спадчыне навучэнцамі, авалоданне навыкамі працы ў ДПМ дапамагаюць развіваць прафесійныя і гуманітарныя кампетэнцыі.

Істотнымі пагрозамі гэтаму элементу нематэрыяльнай культурнай спадчыны з'яўляюцца парушэнне аўтарскіх правоў майстроў выцінанкі і плагіят. Кожны прадстаўнік маладзечанскай школы выцінанкі мае мастацкую адукацыю і свой непаўторны аўтарскі стыль і стылізацыю. Вельмі часта іх творы выкарыстоўваюцца без аўтарскага дазволу для сучаснага дызайну адзення, інтэр'ераў, відэаінсталяцый. Былі выпадкі выкарыстання плагіятарамі выцінанак маладзечанскіх майстроў у

камерцыйнай дзейнасці. Ёсць месца плагіяту выкананых твораў і запазычанне асобных элементаў у выцінанках майстроў другіх краін (Расія, Украіна, Польшча). Гэта нівеліруе асаблівасці беларускай выцінанкі, такім чынам знішчаецца арыгінальнасць твораў і творчы патэнцыял майстроў.

Беларускае мастацкае выразанне мае традыцыйныя, самабытныя карані. Маладзечанская школа, увасабляючы сукупнасць прыёмаў, стылістыкі і тэматыкі, сфарміравалася на аснове аўтэнтычнага і прафесійнага напрамкаў. Шмат выпускнікоў аддзялення дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Маладзечанскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. К. Агінскага працягваюць справу развіцця гэтага віду традыцыйнага мастацва. Зараз назіраецца адваротны працэс – вобразы выцінанак маладзечанскай школы з'яўляюцца ў інтэр'ерах сялянскага і гарадскога асяроддзя і выкарыстоўваюцца сучаснымі дызайнерамі як аўтэнтычная аснова. Ёсць надзея, што беларуская выцінанка будзе мець новых прыхільнікаў і носьбітаў, будзе развівацца і працягваць традыцыі, набываючы этнакультурную значнасць па ўсёй Беларусі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. *Коваленко, В. И.* Искусство вытинанки : пособие для учителей общеобразовательных учреждений / В. И. Коваленко. – Минск : Беларусь, 2007. – 118 с.

2. Маладзечанская школа выцінанкі : метад. дапам. / ДУ МАЦНТ ; склад. Л. Л. Чырвонцава. – Мінск, 2019. – 65 с. : іл.

3. *Сахута, Я. М.* Беларуская выцінанка / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2008. – 230 с.

4. *Сахута, Я. М.* Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1997. – 287 с. : іл.

5. Художественный замысел и его воплощение средствами вырезания : материалы II Междунар. симпоз., Москва, сентябрь, 2008 г. / Домодедовский истор.-худож. музей ; отв. ред. А. А. Петриченко. – М. : Культура и традиции, 2009. – 224 с.

6. Художественное вырезание: многообразие видов : материалы VIII Междунар. симпоз., Молодечно, 26–28 июня 2020 г. / Домодедовский истор.-худож. музей ; отв. ред. А. А. Петриченко. – М. : Скороходов В. А., 2020. – 310 с.



1



2

Кустодії. XVIII ст.:
1. ЧОІМ.
2. НМІУ.

*Мал. 1.* Кустодыі XVIII ст.



*Мал. 2.* Батлейка з папяровымі выразкамі



*Мал. 3.* Інтэр’ер беларускай хаты з папяровымі фіранкамі



*Мал. 4.* Наталля Адзінец – найстарэйшы майстар выцінанкі Беларусі



*Мал. 5.* Вікторыя Чырвонцава, настаўнік дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ДМШ г. Маладзечна




*Мал. 6.* Наталля Чырвонцава, Сафія Падкарытава,
Лізавета Чырвонцава – дынастыя майстроў



*Мал. 7.* Людміла Валковіч-Борыс з навучэнцамі аддзялення ДПМ



*Мал. 8.* Узоры выцінанак









*Мал. 9.* Узоры выцінанак



*Мал. 10.* Узоры выцінанак: архітэктурныя беларускія помнікі





*Мал. 11.* Узоры выцінанак: архетыпічныя сімвалічныя вобразы







*Мал. 12.* Узоры выцінанак: міфалагічныя персанажы







*Мал. 13.* Узоры выцінанак



*Мал. 14.* Дыпломныя работы навучэнцаў аддзялення ДПМ



ПРЫ СОНЦЫ ЦЕПЛА
У ДОБРАЙ ГАЛАВЫ
СТО РУК




У ДОБРАЙ ГАЛАВЫ
СТО РУК
ГРАК НА ГАРЫ
ВЯСНА НА ДВАРЫ





*Мал. 15.* Дыпломныя работы навучэнцаў аддзялення ДПМ